**К. Дз. Варанько,** *вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

# Да юбілею Р. І. Кліма

**Сёлета 25 мая спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння (1933) Р. І. Кліма, спартсмена і трэнера (лёгкая атлетыка, кіданне молата).**

Неаднойчы прадстаўляў Беларусь на спартыўнай міжнароднай арэне адзін з найлепшых спартсменаў краіны, славуты беларускі кідальнік молата, алімпійскі чэмпіён, шматразовы рэкардсмен свету, Еўропы і СССР Рамуальд Іосіфавіч Клім.

Нарадзіўся Р. І. Клім у вёсцы Хвоева Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Спортам пачаў займацца яшчэ ў сярэдняй школе. Паступіў у Інстытут фізічнай культуры і ў 1955 г. стаў першаразраднікам у кіданні молата. Яго трэнерам быў Я. М. Шукевіч, які ў той час ужо падрыхтаваў першага беларускага алімпійскага чэмпіёна (сярэбраны медаль) М. П. Крываносава. Пасля заканчэння інстытута малады спартсмен стаў выкладчыкам фізічнага выхавання ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Потым пераехаў у Віцебск, дзе ў гэты час працаваў яго трэнер. У 1959 г. на чэмпіянаце сельскай моладзі сацыялістычных краін Р. Клім заняў першае месца. У 1963 г. ён быў трэцім на ўсіх адказных спаборніцтвах, але ў канцы гэтага года меў ужо другі вынік па краіне і трапіў у зборную СССР.

На трэніроўках перад XVIII Алімпійскімі гульнямі ў Токіо (1964 г.) Р. Клім устанавіў новы рэкорд СССР, а на самой Алімпіядзе пераўзышоў гэты вынік у некалькіх спробах і выйграў Алімпійскія гульні — стаў першым беларускім спартсменам, які заваяваў залаты медаль у гэтым відзе спорту. На XIX Алімпійскіх гульнях у Мехіка (1968 г.) Р. Клім у некалькіх спробах устанаўліваў алімпійскія рэкорды, але ў апошняй саступіў венгру Д. Жывоцкі і атрымаў сярэбраны медаль. За сваё доўгае і плённае спартыўнае жыццё Р. І. Клім быў чэмпіёнам Еўропы 1966 г., уладальнікам Кубкаў Еўропы 1965 і 1967 гг., чатырохкратным чэмпіёнам (1966—1968, 1971) і сярэбраным прызёрам (1965, 1969) чэмпіянатаў СССР па лёгкай атлетыцы, двухкратным чэмпіёнам (1967 і 1971) і бронзавым прызёрам (1963) Спартакіяд народаў СССР. І сёння тэхніка кідання молата Р. Кліма лічыцца ў свеце эталоннай.



У 1973 г. Р. Клім пакінуў вялікі спорт і амаль адразу пачаў трэніраваць кідальнікаў у СКА БВА (Спартыўны клуб арміі Беларускай ваеннай акругі), дзе вывеў многіх спартсменаў на чэмпіёнскі ўзровень, а ў 1989 г., праз год пасля дэмабілізацыі ў чыне падпалкоўніка, перайшоў на працу ў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (Беларускі дзяржаўны універсітэт фізічнай культуры). Як вопытны настаўнік, загадчык кафедры лёгкай атлетыкі (1995—1996), прафесар-кансультант, ён шмат робіць для развіцця спорту нашай краіны. Р. І. Клім — трэнер нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь, не адно дзесяцігоддзе займаецца спартыўным арбітражам. Ён — суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі па лёгкай



Міжнародная федэрацыя лёгкай атлетыкі ў 1992 г. надала турніру статус міжнароднага.

Для далейшага чытання:

Клім Рамуальд Іосіфавіч // Беларус. энцыкл. : у 18 т. — Мінск, 1999. — Т. 8. — С. 336.

Клим Ромуальд Иосифович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 6 т.]. — Минск, 2007. — Т. 4. — С. 73.

Клим Ромуальд Иосифович // Спортивная энциклопедия Беларуси. — Минск, 2005. — С. 224.

Клим Ромуальд Иосифович // Кто есть кто в Республике Беларусь. Спорт. энциклопедия. — Минск, 1999. — С. 105.

Клим Ромуальд Иосифович // Кто есть кто в Республике Беларусь / Белорус. науч.-исслед. ин-т документоведения и архив. дела. — Минск, 1999. — С. 132—133.

атлетыцы, выконваў абавязкі алімпійскага рэферы.

За спартыўныя дасягненні і трэнерскую дзейнасць Р. Клім адзначаны званнямі заслужаны майстар спорту СССР, майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі і заслужаны трэнер Беларусі, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

З 1976 г. у Мінску праводзіцца турнір кідальнікаў на прызы Рамуальда Кліма.

«Лёс і Радзіму не выбіраюць» // Мы — беларусы / [уклад.: Т. М. Бондар, П. П. Рабухін; аўт. тэксту І. І. Кахновіч і інш.]. — Мінск, 2005. — Кн. 2. — С. 68.

Клим Ромуальд Иосифович // Олимпийская страна Беларусь / [П. П. Рябухин и др.; редкол.: Г. П. Алексеенко и др.]. — Минск, 2004. — С. 102—104.

Гл. таксама афіцыйны сайт БДУФК: http//www.sportedu.by.